Schweizerische Eidgenossenschaft
Confédération suisse
Confederazione Svizzera
Confederaziun svizra

Swiss Confederation

Federal Department of Justice and Police FDJP
**State Secretariat for Migration SEM**



# Праца ў Швейцарыі

# Швейцарыя як краіна для іміграцыі

Швейцарыя, краіна ў цэнтры Еўропы, мае даўнія традыцыі іміграцыі. У сувязі з яе стабільным эканамічным і палітычным становішчам многія шматнацыянальныя кампаніі змяшчаюць свае штаб-кватэры ў Швейцарыі. Швейцарыя з'яўляецца лідэрам у даследаваннях і распрацоўках дзякуючы яе славутым універсітэтам. Многія людзі з розных краін жывуць і працуюць у Швейцарыі за кошт яе стабільнага працоўнага рынку.

# **Праца** ў Швейцарыі

Любая асоба, якая жадае працаваць у Швейцарыі, павінна мець **дазвол на працу, перш чым прымаць** запрашэнне на прыбытковую працу.

Акрамя **дзейснага дазволу на працу**, у выпадку, калі асобам патрэбна віза, **дзейсная віза** неабходна для ўезду ў краіну (гл. кантакты).

## Хто можа працаваць у Швейцарыі?

Швейцарыя вядома сваёй двайной сістэмай аўтарызацыі замежных работнікаў:

грамадзяне краін, якія ўваходзяць у ЕС/ЕАВГ, маюць прыярытэт у выпадку аўтарызацыі доступа на рынак працы.

Грамадзянам усіх іншых краін (так званыя, грамадзяне трэціх краін) дазволена ўдзельнічаць у швейцарскім рынку працы ў дадатак да работнікаў з краін, якія ўваходзяць у ЕС/ЕАВГ, але павінны адпавядаць дадатковым патрабаванням:




## Крытэрыі дазволаў для грамадзян трэціх краін

1. Работнікі, якія **не** паходзяць з краін, якія ўваходзяць у ЕС/ЕАВГ, могуць працаваць у Швейцарыі толькі на вышэйшых кіраўнічых пасадах, у якасці спецыялістаў ці іншага кваліфікаванага персанала. Дазволы выдаюцца толькі ў адпаведнасці з **агульнымі эканамічнымі інтарэсамі** Швейцарыі.

Асобы з **вышэйшай або палітэхнічнай адукацыяй**, якія маюць некалькі гадоў прафесійнага вопыту, лічуцца **кваліфікаванымі**. У залежнасці ад прафесіі ці спецыялізацыі людзі са спецыяльнай тэхнічнай падрыхтоўкай і некалькімі гадамі прафесійнага вопыта таксама маюць права на працаўладкаванне.

2. Замежныя работнікі маюць права атрымліваць **такую ж заработную плату і тыя ж умовы працы**, што і мужчыні і жанчыны са Швейцарыі.

3. Грамадзяне трэціх краін атрымліваюць дазвол толькі калі на працоўнае месца не прэтэндуе грамадзянін Швейцарыі ці краіны, якая ўваходзіць у ЕС/ЕАВГ.

4. Колькасць дазволаў на працу, выданых грамадзянам трэціх краін у Швейцарыі, **абмежавана** (максімальная колькасць)**.**

## 8-дзённы рэгламент

У якасці агульнага правіла адсутнічаюць патрабаванні да атрымання дазволаў у выпадку транснацыянальных паслуг, якія прапаноўваюць на працягу да васьмі дзён у календарны год. Аднак для ўезду можа патрабавацца віза. Гл. адпаведныя палажэнні аб візах. У пэўных галінах (асабліва ў эратычным забаўляльным сектары) **дазвол на працу патрабуецца, пачынаючы з першага дня**. Вызначце для сябе кампетэнтны орган улады, у які трэба звярнуцца, калі вам патрабуецца дазвол на працу (гл. кантакты).

## Немагчымасць працы **без дазволу**

Любая асоба, якая працуе ў Швейцарыі без дазволу на працу, сцвярджае, што яна **можа быць пакарана** (заключэнне тэрмінам да аднаго года ці штраф). Тое ж датычыцца работадаўца, які прыцягвае грамадзяніна замежнай краіны да працы без дазволу на працу.

Любая асоба, якая незаконна застаецца ў Швейцарыі **можа быць дэпартавана** з краіны і атрымаць **забарону на ўезд** у зону Шэнгенскага пагаднення.

## **як** і **дзе** падаць заяўку на атрыманне **дазволу на працу**?

У Швейцарыі работнікі (мужчыны і жанчыны) нясуць адказнасць за атрыманне дазволу на працу. Яны падаюць заяўку на рынак працы ці ў міграцыйныя ўлады ў адпаведным кантоне. Гэтыя органы ўлады паведамляюць ім інфармацыю аб працэдуры і дакументах, якія трэба падаваць разам з заяўкай.

Калі ў вас **праблемы з работадаўцам**, звярніцеся ў наступны кантактны цэнтр:

- www.ch.ch
  → Work → Employment law
  → Labour disputes: Who to contact

- кампетэнтныя ўлады кантона

# Кантакты

**Прадстаўнік Швейцарыі ў вашай роднай краіне**
www.eda.admin.ch
→ Representations and travel advice

**Дадатковыя звесткі аб працаўладкаванні грамадзян краін, якія не ўваходзяць у ЕС/ЕАВГ**
www.sem.admin.ch
→ Entry & Residence → Labour / Work permits
→ Non-EU/EFTA Nationals

**Дадатковыя звесткі аб уездзе і візах**
www.sem.admin.ch
→ Entry & Residence → Entry

**Улады кантонаў**
www.sem.admin.ch
→ About us → Contact → Cantonal authorities
→ Cantonal immigration and labour market authorities

**Незаконная праца: Дзяржаўны секратарыят па эканамічных справах**
www.seco.admin.ch
→ Topics → Labour: Travail au noir / Schwarzarbeit

**Агульная інфармацыя аб Швейцарыі**
www.ch.ch
www.admin.ch

*Дзяржаўны секратарыят па міграцыі, 2015*

*Photos: Hermann & Eyer*